Што можа [illegible] больш пачэсным для педагога, як навучыць любові да зямлі бацькоў? Выхаваць п[illegible]ёта, заахвочваючы творчымі справамі, якія на пачатку можна ажыццяўляць разам з выкладчыкамі, а пасля — самастойна, і яшчэ лепш — стаць настаўнікам для іншых: таксама умець заахвоціць, падзяліцца ўжо набытымі ведамі.

# Вучыць любові да зямлі бацькоў

## Радзімазнаўства як аснова даследчай дзейнасці навучэнцаў



**Алена Валянцінаўна Свірыдава,**
выкладчык беларускай мовы і літаратуры, кіраўнік народнага музея гісторыі УА «Мар'інагорскі дзяржаўны ордэна "Знак Пашаны" аграрна-тэхнічны каледж імя У. Е. Лабанка». Закончыла БДПУ імя Максіма Танка па спецыяльнасці «беларуская мова і літаратура». Педагагічны стаж — 18 гадоў.

Каб задаволіць спазнавальныя патрэбы навучэнцаў, паглыбіць іх веды, трэба прапанаваць новую інфармацыю, факты, цікавыя з'явы. А фактаў такіх шмат, бо ў нашым каледжы набываюць прафесію навучэнцы з розных рэгіёнаў краіны. Большасць з навучэнцаў ужо спазналі таямніцы сваёй малой радзімы — той мясціны, адкуль яны прыехалі, — і гатовы для спасціжэння новага.

Багаты краязнаўчы матэрыял дапамагае зацікавіць вывучэннем таямніц гісторыі, адчуць гонар за таленавітых землякоў і выпускнікоў каледжа, выхаваць любоў да малой радзімы. Навучэнцы вывучаюць біяграфію славутых людзей — навукоўцаў, кіраўнікоў, адміністратараў, аўтараў падручнікаў, — якія жылі і вучыліся ў нашым пасёлку. Гэта добры прыклад для пераймання, выхавання грамадзянскай пазіцыі і патрыятызму, для пастаноўкі перад сабой канкрэтнай жыццёвай мэты: «Я ганаруся краінай, малой радзімай, дзе нарадзіліся, жылі, вучыліся, працавалі і стваралі такія таленавітыя людзі. Я ганаруся гэтымі людзьмі, але ж і я таксама, як і яны, маю дачыненне да гэтай мясцовасці і ўстановы адукацыі — і гэта таксама ганарова!».

Выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу ў арганізацыі даследчай дзейнасці павышае цікавасць да вывучэння гісторыі малой радзімы. Усе праекты, распрацаваныя за апошні час у народным музеі гісторыі Мар'інагорскага дзяржаўнага ордэна «Знак Пашаны» аграрна-тэхнічнага каледжа імя У. Е. Лабанка, маюць краязнаўчую аснову, і тэматыка даследаванняў разнастайная. Трапляючы ў народны музей гісторыі каледжа, кожны мае магчымасць пракласці сваю сцежку даследавання. Некага цікавяць назвы ўстановы адукацыі — мы прайшлі плённы шлях станаўлення і развіцця ад сельскагаспадарчай школы да аграрна-тэхнічнага каледжа. За 144 гады існавання ўстановы яе назва мянялася



*Храм у гонар Святой Тройцы у аграгарадку Блонь*

трынаццаць разоў. Трынаццаць радкоў на стэндзе, якія адлюстроўваюць развіццё адукацыі ў краіне і дасягненні ў сельскагаспадарчым навучанні, і змены ў правапісе, і ўзнагароды… Хтосьці звяртае ўвагу на паходжанне назвы паселішча Мар'іна Горка. Нехта не можа адарваць вачэй ад фотаздымка храма Успення Багародзіцы. Некаму цікава, хто такі Міхаіл Рудовіч, імем якога названа не толькі цэнтральная вуліца ў пасёлку Мар'іна, але і чытальная зала бібліятэкі каледжа, пры гэтым яго няма ў спісе знакамітых выпускнікоў. Хто такі Уладзімір Лабанок, чыё імя носіць каледж? Гэта далёка не ўсе тэмы для даследаванняў, якія можа прапанаваць экспазіцыя народнага музея гісторыі. Тое, да чаго прызвычаілася ўжо больш дарослая аўдыторыя, становіцца прывабнай загадкай для таго, хто адгортвае новую старонку свайго жыцця, атрымаўшы статус навучэнца каледжа.

Усе матэрыялы, падрыхтаваныя для ўдзелу ў конкурсах і акцыях, грунтуюцца на мясцовым матэрыяле, бо гісторыя каледжа адлюстроўвае значныя гістарычныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі нашай краіны. Навучэнцам цікава «прымяраць» вядомыя гістарычныя факты на гісторыю малой радзімы.

У мінулым навучальным годзе (2018/2019) мы распачалі працу «Страчаная спадчына» для ўдзелу ў конкурсе літаратурна-даследчых работ «Праваслаўныя святыя і святыні Барысаўскай епархіі». У лістападзе 2019 года работа была адзначана дыпломам III ступені. Яе аўтар Іван Лахадыр быў запрошаны на ўрачыстыя мерапрыемствы Барысаўскай епархіі. Даследаванне прысвечана вывучэнню храма, з якога пачынаецца і гісторыя ўстановы адукацыі. Яго ўзарвалі ў 1939 годзе, але праз 80 гадоў з'явіўся новы — адзіны на тэрыторыі сярэдняй спецыяльнай установы адукацыі ў нашай краіне. Іван абраў гэты кірунак даследавання не выпадкова. Ён нарадзіўся і вырас у пасёлку Мар'іна, тут нарадзіўся яго бацька. А яшчэ раней — у канцы 1960-х гадоў сюды маладымі спецыялістамі прыехалі працаваць яго дзядуля і бабуля. Падлетку важна і пачэсна захоўваць памяць пра сваіх продкаў, пра зямлю, на якой яны жылі і працавалі.

Пункт асаблівай ўвагі для нашых навучэнцаў — храм Святой Таццяны, апякункі студэнцтва. Ён знаходзіцца ў самым цэнтры пасёлка Мар'іна, таму яго ніяк не мінеш, спяшаючыся на заняткі. Сёння дакладна можна сказаць, што пачаткам даследчай дзейнасці нашых выхаванцаў у гэтым кірунку сталі пытанні на адным з выхаваўчых мерапрыемстваў: «Ці ведаеце вы, што храм святой пакутніцы Таццяны ў пасёлку Мар'іна — першая і пакуль адзіная капліца ў нашай краіне, пабудаваная на тэрыторыі сярэдняй спецыяльнай установы адукацыі? Чаму яна пабудавана менавіта ў нас?».

Зацікавіў навучэнцаў і той факт, што святыня Барысаўскай епархіі — Мар'іногорская ікона Маці Божай — доўгі час была незаўважаная. Другое жыццё і высокі статус яна набыла дзякуючы нашаму выпускніку 1962 года Ігару Корзуну. Цяпер мы яго ведаем як архіепіскапа Пінскага і Лунінецкага Стэфана. Ён прыехаў на адзін з юбілеяў каледжа і захацеў наведаць храм у гонар Святой Тройцы, які будучы архіепіскап ўпотай наведваў падчас вучобы. Там і ўбачыў гэты абраз. Храм знаходзіцца ў непадалёк ад пасёлка Мар'іна, у аграгарадку Блонь (на момант вучобы Ігара Корзуна храма Успення Багародзіцы ў студэнцкім пасёлку ўжо не было). Даследаванне ўключала гутаркі з мясцовымі жыхарамі — сведкамі гісторыі, вывучэнне і аналіз літаратуры, інтэрнэт-

крыніц, працу ў Нацыянальным архіве, сустрэчы са святарамі, наведванне кафедральнага сабора Святога дабравернага князя Аляксандра Неўскага ў Мар'інай Горцы.

Адзін факт, як правіла, закранае, высвечвае іншыя. Так мы больш дэталёва пазнаёміліся з цікавай гісторыяй пабудовы храма Успення Багародзіцы, яго лёсам, біяграфіямі людзей, якія зрабілі з'яўленне храмаў у пасёлку справай свайго жыцця — святара Фамы Русецкага, грамадскага дзеяча Міхаіла Аляксейчыка.



*Навучэнцы слухаюць аповед Рыгора Ільіча Грабчыкава*

На навукова-практычных канферэнцыях з міжнародным удзелам «Зямля — наш агульны дом», «У свет творчасці, у свет пошуку, у свет навукі» даследчая работа «Ружы ў крапіве на жыццёвым шляху Захара Біралы» навучэнца Мікіты Малашука двойчы адзначана дыпломамі III ступені. Работа прысвечана нашаму земляку Захару Біралу, які доўгі час выкладаў у каледжы беларускую мову і літаратуру. Штуршком да абуджэння цікавасці да гэтай неардынарнай асобы стала квэст-гульня для першакурснікаў. На доме ў пасёлку Мар'іна, дзе жыў Захар Якаўлевіч, размешчана мемарыяльная дошка — адна з дзвюх у пасёлку.

Выконваючы заданні квэста, першакурснікі павінны былі звярнуць асаблівую ўвагу на тэкст, які размешчаны на дошцы, а каб адказаць на пытанне і перайсці на наступны ўзровень гульні, трэба было шукаць адказ у экспазіцыі нашага музея і знаёміцца з творчасцю паэта. Асобныя біяграфічныя факты прыцягнулі ўвагу навучэнцаў. м стала цікава, як у адно імгненне змянілася жыццё настаўніка ў канцы 1930-х гадоў, як яно наладжвалася пасля выпрабаванняў лёсу — эта і стала асновай для даследавання. Каб атрымалася якасная конкурсная работа, за ўзор апрацоўкі матэрыялу былі ўзятыя краязнаўчыя даследаванні Сцежкамі Ігуменшчыны», «Старонкі радзімазнаўства. Мясціны. Асобы», «І марам волю дам» нашага земляка Алеся Карлюкевіча. Адзначым, што менавіта лесь Мікалаевіч прапаноўвае для абазначэння працэсу спазнання гісторыі роднага краю выкарыстоўваць тэрмін «радзімазнаўства», які эльмі падабаецца і выкладчыкам, і нашым выхаванцам.

Мінулы навучальны год прайшоў пад знакам юбілейных дат: 75-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 75-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Нашы землякі годна прайшлі ўсе выпрабаванні, і мы не маем права забываць пра іх подзвіг. Пра гэта мы расказвалі ў даследаваннях і працах, якія падрыхтавалі для рэспубліканскага конкурсу віртуальных музеяў устаноў адукацыі «Вялікая Перамога: 75 мірных гадоў» (дыплом РІПА), абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу «Іх подзвіг мы ў сэрцы захоўваем» у межах рэспубліканскай героіка-патрыятычнай акцыі «Вялікай Перамозе — 75!» (дыплом III ступені), рэспубліканскага конкурсу музеяў устаноў адукацыі «У гонар агульнай Перамогі» (дыплом II ступені).

На аснове матэрыялаў народнага музея падрыхтавана работа «Пасланне ветэрану» Івана Лахадыра для ўдзелу ў конкурсе «Вялікая Перамога: спадчына і нашчадкі». Праца прысвечана герою Вялікай Айчыннай вайны, жыхару пасёлка Мар'іна Уладзіславу Мікалаевічу Васільеву — гэта праект, распачаты да 75-годдзя вызвалення Беларусі. У 2018/2019 навучальным годзе ён быў адзначаны сертыфікатам, а ў 2019/2020 — прыняты да ўдзелу ў рэспубліканскай акцыі «Павіншуем ветэранаў разам» і размешчаны ў групе «Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства» (https://vk.com/centrkraevedeniay).

Літаратурныя творы «Подых смерці» Максіма Канаша, «О войне из первых уст» Івана Лахадыра, «Раненое детство» Івана Пракапца апублікаваны ў зборніку «Жывая памяць». Крыніцай натхнення сталі музейныя матэрыялы: «Подых смерці» — прысвечана пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў нашым пасёлку, створана на аснове ўспамінаў выпускніцы Каці Круглік; «О войне из первых



*На занятках аб'яднання па цікавасцях у музеі*

уст» — мастацкая інтэрпрэтацыя аповеду Уладзіслава Васільева падчас сустрэчы з навучэнцамі, а «параненае дзяцінства» праз усё жыццё пранёс заснавальнік музея гісторыі каледжа Рыгор Ілліч Грабчыкаў, чым і падзяліўся з намі незадоўга да выхаду на заслужаны адпачынак.

У гэтым годзе да даследчай дзейнасці далучыўся і дырэктар каледжа — Дзяніс Валер'евіч Зубенка. Калі ў красавіку 2020 года была абвешчаная рэспубліканская акцыя «Юнгі Перамогі», ён падзяліўся ўспамінамі пра свайго дзеда — марака Мікалая Ягоравіча Сафронава. Біяграфічны партрэт стаў асновай для творчай работы «Успаміны Цыганчонка». Асабліва цікава навучэнцам было вывучаць і працаваць з сямейным архівам. У сям'і дырэктара каледжа ён захоўваецца ў выглядзе кнігі «Родам з Мар'інай Горкі», створанай сынам М. Я. Сафронава Мікалаем (дзядзька дырэктара), алічбаваных фотаздымкаў і крэатыўна аформленага матэрыялу для ўдзелу ў акцыі «Беларусь памятае». Кульмінацыйным момантам стаў аповед дырэктара пра сваю сям'ю. Менавіта шчырасць і праўдзівасць дазволілі навучэнцам інакш паглядзець на свае сямейныя гісторыі, зразумець неабходнасць захавання памяці пра сям'ю, пра тую зямлю, на якой нарадзіліся, жывуць і працуюць іх бацькі, бабулі і дзядулі, бо з гэтай «маленькай» гісторыі і складаецца вялікая гісторыя краіны.

Даследчая дзейнасць будзе паспяховая, калі ўлічваць інтарэсы і захапленні выхаванца — важна, каб ён сам знайшоў цікавую яму тэму даследавання. Падчас самастойнай даследчай дзейнасці фарміруюцца і ўдасканальваюцца камунікатыўныя ўменні і навыкі, якія так запатрабаваны ва ўмовах сучаснасці.

Важна не толькі займацца даследчай і пошукавай дзейнасцю, але і прадстаўляць плён дзейнасці, дзяліцца творчымі вынікамі і набыткамі з калегамі. Нам у гэтым дапамагае сайт народнага музея (http://museum.mgatk.by), дзе змешчана большасць даследчых работ (раздзел «Даследчая дзейнасць»), ілюстраваных прэзентацыямі. У раздзеле «Нашы дасягненні» — дыпломы навучэнцаў і выкладчыкаў, якія займаюцца даследчай дзейнасцю.

Вывучэнне роднага краю, яго гісторыі, геаграфіі і культурнай спадчыны — адзін з найважнейшых сродкаў сувязі навучання і выхавання з жыццём. Гэта і эстэтычнае, і маральнае, і, безумоўна, грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне. Краязнаўства часта становіцца цікавай асновай для рэалізацыі даследчай дзейнасці. Уласны вопыт і вопыт калег падказвае, што чым больш ведаў пра родны край мы ўжо маем, тым больш мы шануем, любім малую радзіму.

**Літаратура**

1. Буторына, І. А. Сцяжынкамі радзімазнаўства : мерапрыемствы краязнаўчага накірунку паводле твораў Уладзіміра Ліпскага і Алеся Карлюкевіча / І. А. Буторына. — Мінск : Белпринт, 2013. — 280 с.

2. Карлюкевіч, А. М. І марам волю дам : Літаратурная карта Пухавіччыны / А. М. Карлюкевіч. — Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. — 304 с.

3. Карлюкевіч, А. М. Старонкі радзімазнаўства : Мясціны. Асобы : краязнаўчыя нарысы / А. М. Карлюкевіч. — Мінск : Выдавецкі дом «Звязда», 2013. — 384 с.

4. Карлюкевіч, А. М. Сцежкамі Ігуменшчыны / А. М. Карлюкевіч. — Мінск : Беларусь, 2008. — 247 с.

5. Кушняроў, В. А. З любоўю да Радзімы / В. А. Кушняроў // Образование Минщины. — 2019. — № 2 (79). — С. 74–76.

6. Мальдзіс, А. Ад краязнаўства да радзімазнаўства / А. Мальдзіс // Краязнаўчы рэсурс у вывучэнні беларускай літаратуры / А. М. Карлюкевіч. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2015. — 296 с.

7. Радкевіч, А. Ф. Родным краем ганаруся / А. Ф. Радкевіч // Образование Минщины. — 2020. — № 1 (84). — С. 49–51.